**Пасланне да Раджджаства Хрыстовага**
**Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла**
**архіпастырам, пастырам, дыяканам, манахам і ўсім верным сынам і дочкам**
**Рускай Праваслаўнай Царквы**

**Узлюбленыя ў Госпадзе архіпастыры,**
**пачэсныя прасвітары і дыяканы, багалюбныя інакі і інакіні,**
**дарагія браты і сёстры!**

Невымоўная любоў Божая сабрала нас сёння, каб *у адзінстве духу і саюзе міру* (Эф. 4, 3) сустрэць адно з найбольш урачыстых і разам з тым таямнічых святаў Царквы – Раджджаство Госпада нашага Ісуса Хрыста. Праслаўляючы прышэсце ў свет Спасіцеля, сардэчна віншую ўсіх вас, мае дарагія, з гэтай радаснай падзеяй, якая адкрыла новую эпоху ў адносінах паміж Богам і людзьмі.

Кожны раз узіраючыся ў тое, што адбылося два тысячагоддзі таму, мы спрабуем спасцігнуць веліч цуду Богаўцялеснення і не перастаем здзіўляцца добрасці і міласці нашага Стварыцеля. На працягу доўгіх стагоддзяў чалавецтва знемагала ў напружаным чаканні абяцанага Госпадам *Прымірыцеля* (Быц. 49, 10): *Цара праведнага, Які спасае* (Зах. 9, 9), *на імя Якога будуць спадзявацца народы* (Іс. 42, 4). І вось, калі, нарэшце, наступіла паўната часоў, *Дзіця нарадзілася нам* (Іс. 9, 6), *каб кожны, хто веруе ў Яго, не загінуў, але меў жыццё вечнае* (Ін. 3, 16). Любоў Божая, *вышэйшая за пазнанне* (Эф. 3, 19), паслала ў свет *не хадайніка, не ангела*, не моцнага і магутнага правіцеля, як думалі людзі. Сам Бог уцялесніўся, каб вызваліць чалавека ад улады граху і зла.

Але выклікае здзіўленне тое, што найвялікшая ў гісторыі падзея, пра якую абвяшчалі старазапаветныя прарокі і якую прадчувалі нават выдатныя мысліцелі старажытнасці, адбылася так сціпла і знешне непрыкметна. Спаў Віфлеем. Спаў Іерусалім. Спала ўся Іудзея. Гасподзь Уседзяржыцель – Цар цароў і Уладыка сусвету – явіўся свету не пад урачыстыя *трубныя гукі* (Пс. 150, 3) і ўсеагульнае лікаванне, але пакорліва і ціхмяна, у начной цішыні ўбогай пячоры. Яго апяваў сонм ангелаў і нямногія пастухі, якія прыйшлі *паглядзець тое, што адбылося* (Лк. 2, 15).

У самым пачатку Свайго зямнога шляху Гасподзь нібы хоча «*ў межах прыніжэння паказаць прыклад дабрадзейнасці*», – разважае свяціцель Іаан Залатавуст. Так высакародна дзейнічае толькі дасканалая любоў, якая *не шукае свайго* (1 Кар. 13, 5), не выстаўляе сябе напаказ і не патрабуе пашаны і славы, але гатова пераносіць дзеля карысці блізкіх (бліжніх) усе нястачы і смутак. «*Менавіта таму*, – працягвае ўсяленскі настаўнік Царквы, – *Гасподзь прымае маё цела, каб я ўмясціў Яго Слова, і, прыняўшы маю плоць, дае мне Свайго Духа, каб, і даючы, і прымаючы, перадаць мне скарб жыцця*» (Слова на Раджджаство Хрыстова). У гэтым і раскрылася нам шчодрая любоў Божая, бо мы атрымалі сапраўдны *скарб жыцця* – Самога Госпада, *таму што ўсё з Яго, і праз Яго, і дзеля Яго* (Рым. 11, 36).

Любоў – сапраўдная прычына і стваральная сіла Божых учынкаў. Ён прывёў да быцця свет і стварыў чалавека, шчодра надзяліўшы яго дарамі. Паводле любові прыйшоў спасці яго, калі той адпаў ад зносін са сваім Тварцом. Паводле вызначэння Стварыцеля ўвесь сэнс чалавечага жыцця заключаецца ў тым, каб і мы *любілі адзін аднаго* (Ін. 14, 34). Але як гэтага дасягнуць у свеце, дзе столькі зла і нянавісці? Для гэтага перш за ўсё неабходна адкрыць і аддаць сваё сэрца Богу. Толькі Ён можа перамяніць і расшырыць яго так, каб яно, – цяпер такое нямоглае і абмежаванае, – стала здольным умясціць у сабе і бліжніх, і далёкіх, і дабрадзейных, і тых, якія крыўдзяць нас, – усіх тых, каго мы пакліканы любіць паводле запаведзі Хрыстовай, пераймаючы ў *дасканаласці нашага Нябеснага Айца* (Мф. 5, 48).

Схіляючыся ў малітве перад нованароджаным Богадзіцяткам, падумаем, а які ж дар прапануем Уладыку Сусвету мы? Ці можа быць наогул нешта вартае і суразмернае велічы Прадвечнага Тварца? Так, ёсць такі каштоўны дар, якога больш за ўсё жадае Гасподзь: наша пакорлівае сэрца, якое любіць і мілуе. Будзем жа праслаўляць уцялесненага Хрыста не толькі цудоўнымі песнаспевамі і віншавальнымі словамі, але перш за ўсё – добрымі справамі. Падзелімся светлай радасцю Раджджаства з тымі, хто мае ў гэтым патрэбу, сагрэем нашым клопатам бліжніх, наведаем хворых і абцяжараных смуткам. Суцешым і падтрымаем гаротных, пакрыем малітвай *усіх, хто ў роспачы і смутку.*

Вялікая выратавальная сіла любові ацаляе ад раўнадушша і зласлівасці, вылечвае ад нянавісці і крыўды. Яна змякчае норавы бязлітасных і выпраўляе многія хібы грамадскіх адносін! Калі будзем дзейнічаць так, то сапраўды выканаем сваё высокае хрысціянскае пакліканне, бо такой *праявай любові*, паводле слова прападобнага Ісаака Сірына, мы *прыпадабняемся Богу* (Словы падзвіжніцкія. 48).

Таямніца Богаўцялеснення – гэта таямніца рэальнай прысутнасці Бога ў свеце. Апостал і евангеліст Іаан, які прадбачыў жыццё будучага веку, сведчыць пра ўсяцэлае знаходжанне Госпада з людзьмі: *«Ён будзе жыць з імі; яны будуць Яго народам, і Сам Бог будзе з імі, будзе Богам іх»* (Адкр. 21, 3). Аднак гэтая невымоўная таямніца прысутнасці Бога пачынае ажыццяўляцца ўжо тут, на зямлі, бо з Раджджаством Спасіцеля *споўніўся час і наблізілася Царства Божае* (Мк. 1, 15). Мы відавочна ўваходзім у гэтую рэальнасць, утвараючы Адзіную Святую Царкву Хрыстову, праз Якую ўсе мы, мае дарагія, з'яўляемся пасланцамі і прадстаўнікамі гэтага Вышняга Царства любові. Гэтае дзіўнае і глыбокае перажыванне *«з намі Бог»* складае сутнасць таямнічага, патаемнага жыцця Царквы.

Будзем памятаць пра тое, што, калі Сам Уседзяржыцель – *Альфа і Амега, пачатак і канец, першы і апошні* (Адкр. 22, 13) – прыняў у Свае абдымкі чалавечую гісторыю і абяцаў *застацца з намі ва ўсе дні да сканчэння веку* (Мф. 28, 20), то нам няма чаго страшыцца і баяцца трывожных абставін цяперашняга часу. Адклікаючыся на вялікую любоў Спасіцеля, навучымся поўнасцю даручаць сябе Госпаду і спадзявацца на Яго добры Промысел, каб і да Другога слаўнага прышэсця Хрыстовага *нават да апошніх зямлі* (Іс. 8, 9) смела і з радасцю сведчыць,

*што з намі Бог!*

**ПАТРЫЯРХ МАСКОЎСКІ І ЎСЯЕ РУСІ**

*Раджджаство Хрыстова*
*2023/2024 г.*
*Масква*